2. Marsina, R. Slovenské dejiny. Martin: Matica slovenská, 1992. S. 230–263.
3. Šprocha, B. Demografický obraz Slovenska v rokoch 1938-1945. Bratislava: Muzeológia a kultúrne dedičstvo, 2016. – 199 s.
4. Сальков, А. П. Проблема границ и национальных меньшинств в чехословацко-венгерских отношениях (ноябрь 1918 г. – март 1939 г.) // Российские и славянские исследования : науч. сб. Вып. 7 / редкол. : А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. Минск : БГУ, 2012. С. 9–28.
5. Slovensko-nemecké vzt'ahy 1938–1941 v dokumentoch: v 2 sv. Sv. I.: od Mníchova k vojne proti ZSSR [a kol.]. Bratislava: Universum, 2009. 1174 s.
6. Janek, I. The History of the Slovak-Hungarian "Little War" and Its Interpretations in National Histories / I. Janek // Prague Papers on the History of International Relations, 2. Praha: Univerzita Karlova, Ústřední knihovna, 2015. P. 85–101.
7. Ústavný zákon zo dňa 21. júla 1939 o Ústave Slovenskej republiky // Ústav pamäti národa [Электронны рэсурс]. URL: https://www.upn.gov.sk/data/pdf/ustava1939.pdf – Дата доступу: 12.10.2019.
8. Mitáč, J. Juh Slovenska po Viedenskej arbitráži 1938-1945 Bratislava: Ústav pamäti národa, 2011. 291 s.
9. Hetényi, M. The status of Hungarian minority in Slovakia in 1939 – 1940 // Slovensko medzi 14. marcom 1939 a salzburskými rokovaniami. Prešov: Universum, 2007. S. 93–111.
10. Hetényi, M. Propaganda v slovensko-maďarských vzťahoch v rokoch 1938 – 1945. // Forum Historiae. 2012. roč. 6, č. 2. S. 101–113.
11. Janek, I. János Esterházy a slovensko-maďarské diplomatické vzťahy v rokoch 1938-1941 // Slovensko v rokoch neslobody 1938-1989 II. Bratislava: Ústav pamäti národa, 2014. S. 58–74.
12. Пеганов, А. О. Секретные переговоры М. Каллаи и Й. Тисо в 1943 г. в контексте венгеро-словацких отношений в годы Второй мировой войны // Сборник научных статей молодых ученых: вып. 1 / В. Г. Шадурский (общ. ред.) [и др.]. Минск : Четыре четверти, 2012. С. 234–243.
13. Пеганов, А. О. Чехо-словацко-венгерские переговоры в ноябре 1938 – марте 1939 г. о реализации венского арбитражного решения // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 4 / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. Минск: БГУ, 2009. С. 205–210.
14. Пушкаш, А. И. Внешняя политика Венгрии: Февраль 1937 – сентябрь 1939 г. М.: Институт славяноведения РАН, 2003. С. 401–440.
15. Носкова, Х. Венгерское меньшинство в Чехословакии и словацкое – в Венгрии: решение участи // Национальная политика в странах формирующегося советского блока. 1944-1948. М.: Наука, 2004. С. 285–309.
16. Сальков, А. П. Проблема границ и национальных меньшинств в чехословацко-венгерских отношениях (ноябрь 1918 г. – март 1939 г.) // Российские и славянские исследования : науч. сб. Вып. 7 / редкол. : А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. Минск : БГУ, 2012. С. 9–28.
17. Hunćik, P. Madarska mensina ve Slovenskej republice // Etnicke mensiny Stredni Evrope: konflict nebo integrace. Praha: G plus G, 1999. S. 204–218.
18. Hetényi, M. Slovensko-maďarské pomedzie v rokoch 1938 - 1945 Nitra: Univerzita Konštantína Filozofa, 2008. 216 s.
19. Grečo, M. Slováci a revízia hraníc: maďarské klamstvá. Bratislava: Eko-konzult, 2008. – 68 s.
20. Pekár, M. Dejiny Slovenska 1918–1945. Košice: Univerzita Pavla Jozefa Šafárika, 2015. 197 s.

УДК 338.22(438)"200"

## АСАБЛІВАСЦІ ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ПОЛЬШЧЫ Ў 2000-Я ГАДЫ

**Л. А. Козік**

*Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь, kozik@bsu.by*

Эканамічнае развіццё Польшчы ў 2000-я гады цесным чынам звязана з Еўрапейскім саюзам. Рэформы польскіх уладаў былі закліканы усталяваць у краіне рынкавую эканоміку і заканадаўча дастасаваць яе да агульнаеўрапейскіх патрабаванняў. Пасля ўступлення ў ЕС у Польшчу пайшлі новыя інвестыцыі і тэхналогіі, пашырыліся замежныя рынкі збыту,

канкурэнцыя стымулявала развіццё вытворчасці, назіраўся стабільны рост валавага ўнутранага прадукта, паступова змяняліся суадносіны імпарту і экспарту тавараў у бок раўнавагі. Польская эканоміка адносіцца да ліку “даганяючых” эканомік і на сённяшні дзень з’яўляецца адной з тых, што найбольш дынамічна развіваецца. Сярод адмоўных паказчыкаў эканамічнага развіцця краіны выступае дэфіцыт бюджэта, вялікая публічная і знешняя запазычанасць, недастатковы ўзровень інавацыйнасці.

***Ключавыя словы:*** Польшча; Еўрапейскі саюз; дэфіцыт бюджэта; інвестыцыі; гандль; валавы ўнутраны прадукт; інавацыйнасць эканомікі.

## ОСОБЕННОСТИ ЭКОНОМИЧЕСКОГО РАЗВИТИЯ ПОЛЬШИ В 2000-Е ГОДЫ

**Л. А. Козик**

*Белорусский государственный университет*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, kozik@bsu.by*

Экономическое развитие Польши в 2000-е годы тесным образом связано с Европейским союзом. Реформы польских властей были призваны сформировать в стране рыночную экономику и на законодательном уровне приспособить ее к общеевропейским требованиям. После вступления в ЕС в Польшу пришли новые инвестиции и технологии, расширились зарубежные рынки сбыта, конкуренция стимулировала развитие производства, наблюдался стабильный рост валового внутреннего продукта, постепенно менялись соотношение импорта и экспорта в сторону равновесия. Польская экономика относится к числу «догоняющих» экономик и на сегодняшний день является одной из наиболее динамично развивающихся. Среди отрицательных показателей экономического жизни страны выступает дефицит бюджета, большая публичная задолженность и внешний долг, недостаточный уровень инновационности.

***Ключевые слова:*** Польша; Европейский союз; дефицит бюджета; инвестиции; торговля; валовый внутренний продукт; инновационность экономики.

## FEATURES OF POLAND'S ECONOMIC DEVELOPMENT IN THE 2000S

**L. A. Kozik**

*Belarusain State University*
*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, kozik@bsu.by*

Poland’s economic development in the 2000s is closely linked to the European Union. The reforms of the Polish authorities were aimed to form a free market economy in the country and to adapt it to European requirements at the legislative level. After joining the EU, new investments and technologies came to Poland, foreign markets expanded, competition stimulated the development of production, there was a stable growth of gross domestic product, the ratio of imports and exports gradually changed towards equilibrium. The Polish economy is one of the “catching up” economies and today is one of the most dynamically developing. Among the negative indicators of economic development of the country are the budget deficit, large public debt and external debt, insufficient level of innovation.

***Keywords:*** Poland; European Union; budget deficit; investment; trade; gross domestic product; innovation economy.

Эканамічнае развіццё Польшчы ў 1990-я гады шло пад знакам рэформ, мэтай якіх быў пераход ад планавай да рынкавай эканомікі. Важным фактарам у правядзенні пераўтварэнняў стаў намер польскіх уладаў уступіць у Еўрапейскую супольнасць. Сярод патрабаванняў, якім павінна была адпавядаць краіна-кандыдат, былі і эканамічныя. Яны прадугледжвалі існаванне рынкавай эканомікі і яе заканадаўчае дастасаванне да агульнаеўрапейскай сістэмы.

Ужо ў другой палове 1990-х гг. сталі бачны вынікі рэформ, якія распачаў Л. Бальцэровіч. Да канца XX ст. у Польшчы былі прыватызаваны каля 80 % дзяржаўных прадпрыемстваў. У 2001 г. прыватны сектар ахопліваў 73 % працуючых, складаў каля 63 % ВУП і яму належала 76 % прададзенай прамысловай прадукцыі. Актыўна развіваўся фінансавы сектар, малы бізнэс. У канцы XX ст. малыя і сярэднія прадпрыемствы складалі 99 % ад агульнай колькасці фірмаў у Польшчы, а іх доля ў фарміраванні ВУП перавышала 50 % [1, s. 361, 363].

Сусветны крызіс 1997 г., адсутнасць спланаванай сацыяльна-эканамічнай палітыкі і структурных рэформ аказалі негатыўны ўплыў на развіццё польскай

эканомікі ў канцы XX ст. Праведзеныя ўрадам Е. Бузэка (1997-2001) рэформы ў сацыяльнай сферы былі слаба прадуманыя, патрабавалі вялікіх фінансавых выдаткаў. Як следства, кабінет скончыў сваю працу амаль з нулявым ростам ВУП, зніжэннем інвестыцый, нізкім экспартам, падзеннем унутранага попыту, вялікім дэфіцытам бюджэту і ростам беспрацоўя [2]. Калі ў 1999 г. рост ВУП складаў 4,1 %, то ў 2001 г. гэты паказчык знізіўся да 1 % [3, s. 47].

Вырашэнне эканамічных праблем, перш за ўсё звязаных з дэфіцытам бюджэта, а таксама падрыхтоўка краіны да ўступлення ў ЕС сталі галоўнымі задачамі левацэнтрысцкага ўрада Л. Мілера, які быў сфарміраваны па выніках парламенцкіх выбараў 2001 г. Міністр фінансаў Е. Хаўснэр распрацаваў "Праграму ўпарадкавання і абмежавання публічных сродкаў", рэалізацыя якой пачалася ў 2004 г. Яна прадугледжвала дзеянні ў 3 асноўных накірунках: 1) скарачэнне адміністрацыйных выдаткаў, 2) пошук новых сродкаў прыбытку, 3) змены ў сістэме сацыяльных выдаткаў [2]. Запланаваная частка змяненняў, звязаная са зніжэннем выдаткаў адміністрацыі, абмежаваннем выплат на нізкапрыбытковыя праекты, ліквідацыяй фондаў спецсродкаў у міністэрствах, скарачэннем выдаткаў на абарону, павінна была палепшыць становішча з выдаткамі: дазволіць паменшыць іх памер і рацыяналізаваць іх структуру. Аднак для таго, каб правесці аптымізацыю рабочых месцаў, рэструктураваць сферу чыгуначнага транспарту і дабычы вугля, павысіць узровень занятасці людзей з інваліднасцю, абмежаваць магчымасці ранняга выхаду на пенсію, павялічыць пенсійны ўзрост, патрабаваліся дадаковыя сродкі. У такім разе рэформа прадстаўлялася супярэчлівай і відавочна не паляпшала стан дзяржаўнага бюджэту. У гэтай сувязі ў лістападзе 2004 г. частка прапаноў у сацыяльнай сферы не была падтрымана сеймам [4].

Першы год працы ўрада Мілера прынёс шэраг станоўчых перамен: інфляцыя знізілася з 4,3 да 1,2 %, экспарт вырас на 2,8 %, рост гандлю склаў 5,1 %. Аднак меліся і негатыўныя моманты – беспрацоўе вырасла на 1,1 % і склала 17,4 %, скараціліся прыбыткі ад прыватызацыі [5, s. 10-11]. Трэба зазначыць, што ва ўмовах змяншэння агульнай колькасці выдаткаў зніжаецца і інфляцыя, але адваротным бокам гэтага з'яўляецца спад эканомікі і рост беспрацоўя. Апошняе тлумачылася тым, што большасць прадпрыемстваў ўжо перайшла ў прыватныя рукі, а ахвотных укладаць сродкі ў здабываючую, металургічную, энэргетычную галіны, падтрымліваць там стабільную колькасць працоўных месц было няшмат. У краіне назіраліся сацыяльныя праблемы і найбольш вострым было пытанне працаўладкавання. Напярэдадні ўступлення ў ЕС працэнт афіцыйных беспрацоўных у Польшчы дасягнуў паказчыка ў 20 %. Такім чынам, не была вырашана праблема дэфіцыту бюджэта, адмоўнае сальда якога захоўвалася да 2018 г. [6, s. 44, 46].

Значны ўплыў на эканамічную сітуацыю ў Польшчы аказала ўступленне краіны ў Еўрапейскі Саюз. Дзякуючы падтрымцы ЕС, ЗША, Сусветнага банка, Сусветнага валютнага фонда і Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця ў сярэдзіне 2000-х гг. стаў назірацца рост польскай эканомікі. Гэтаму спрыяла ў першую чаргу павелічэнне інвестыцый і субсідыі з ЕС, а таксама з'яўленне новых рынкаў збыту. Даследчыкі адзначаюць, што каля чвэрці ад сярэдняга росту ВУП далі менавіта сродкі ЕС. Яны ж дапамаглі стварыць каля 600 тысяч новых працоўных месцаў [7].

Галоўнай мэтай адзінага еўрапейскага рынка з'яўляецца забеспячэнне чатырох свабод: свабоднага абмена таварамі, людзьмі, паслугамі і капіталам. Гэта, з аднаго боку, адкрывала для Польшчы замежныя рынкі, а з другога вымушала прыстасоўвацца да канкурэнцыі і ўлічваць яе фактар у развіцці вытворчасці і гандлю. Доўгі час Польшча мела адмоўнае сальда ў знешнім гандлі. З 2004 па 2015 г. імпарт дамінаваў над экспартам, і толькі з 2015 г. сітуацыя змянілася. У 2019 г. іх пакажчыкі знаходзяцца прыкладна на аднолькавым узроўні. У параўнанні з 2000 г. за амаль 20 год экспарт польскіх тавараў вырас у 4,5 разы. Толькі ў 2016 г. рост продажаў у доларавым вымярэнні склаў 1,7 %. Каля 80 % польскага экспарту прыходзіцца на ЕС, паступленне тавараў якога ў Польшчу складае каля 60 % ад імпарту [8, s. 16]. На працягу 2010-х гадоў назіраецца рост колькасці тавараў, імпартуемых у Польшчу, аднак захаванне станоўчага сальда ў таваразвароце краіны ў 2019 г. сведчыць пра ў

цэлым добрую дынаміку ў развіцці яе эканомікі [9]. Значную долю польскага экспарта складае прадукцыя машынабудаўніцтва, транспартнага абсталявання, іншыя прамысловыя тавары, сельска-гаспадарчая прадукцыя і інш. Захаванне станоўчага сальда ў тавараздвароце захоўвае і стабільнасць валютнага курса, і стабільнасць інфляцыі, што з'яўляецца каштоўным дасягненнем для будучага росту эканомікі.

Польшча з'яўляецца індустрыяльнай краінай. З пункту гледжання ўдзелу прамысловасці ў фарміраванні дабаўленага кошту яна знаходзіцца на 7 месцы сярод краін ЕС (доля прамысловасці складае 26,3 %) [10]. У сваю чаргу па колькасці пасяўных плошчаў Польшча з'яўляецца трэцяй краінай ЕС. З моманту уступлення ў гэтую арганізацыю сельская гаспадарка пастаянна атрымлівае датацыі з еўрапейскага бюджэта. Толькі за перыяд 2004-2016 гг. польскія фермеры атрымалі 24,7 млрд еўра ў выглядзе прамых выплат. Гэта дазволіла часткова рэструктурызаваць польскую сельскую гаспадарку [7]. На сённяшні дзень Польшча з'яўляецца лідарам у ЕС па продажы гародніны, грыбоў, вырабаў з птушкі. На экспарт ідзе 80 % ад вытворчасці ялавічыны, 45 % птушкі і 30 % малочнай прадукцыі [11].

Уваходжанне Польскай Рэспублікі ў ЕС адкрыла межы, што ва ўмовах высокага беспрацоўя прывяло да міграцыі насельніцтва на Захад. Па некаторых дадзеных, у пошуках працы ў Заходнюю Еўропу выехала каля 2 млн палякаў [6, s. 49]. Гэта мела дваякія наступствы. З аднаго боку, знізілася праблема беспрацоўя, а з другога – польскі ўрад сутыкнуўся з недахопам працоўных рук у шэрагу сектараў эканомікі і сацыяльнай сферы. Ускоснымі фактарамі гэтага стала зніжэнне паступленняў падаткаў, пагоршылася дэмаграфічная сітуацыя (выязжалі на Захад пераважна маладыя людзі) і інш.

Дзейнасць правацэнтрысцкіх урадаў К. Марцынкевіча і Я. Качынскага (2005-2007) прыйшлася на добрую гаспадарчую кан'юнктуру. Аднак праблема дэфіцыта бюджэту па-ранейшаму заставалася актуальнай. Як зазначалі эканамічныя назіральнікі, у сярэдзіне 2000-х гг. польскія ўлады не інвеставалі сродкі ў эканаміку, не будавалі дарогі, не рэфармавалі службу аховы здароўя і адміністрацыі. Фактычна ўсе грошы, якія шлі ў бюджэт дзяржавы, праядаліся [9, s. 52]. Гэта вяло як да росту публічнай, так і знешняй запазычанасці Польшчы. Калі ў 2000 г. апошняя складала 63 млрд $, то ў 2005 г. – 143,1 млрд $, а ў 2009 г. – 218,6 млрд $ [13, s. 46]. У сваю чаргу памер публічнай запазычанасці вырас толькі з 2000 па 2009 г. з 280,5 млрд злотых да 669,9 млрд злотых і працягваў расці [6, s. 48].

Каб зменшыць дэфіцыт бюджэта, ў 2007 г. правячым кабінетам быў прапанаваны шэраг мер. Яны прадугледжвалі ліквідацыю некаторых бюджэтных устаноў, скарачэнне прэміяльнага фонда, выдаткаў органаў мясцовага самакіравання, змены ў падаткаабкладанні і інш. [2]. Аднак да рэалізацыі справа не дайшла, бо на датэрміновых парламенцкіх выбарах перамогу атрымала Грамадзянская платформа. Новы правацэнтрысцкі ўрад сфарміраваў Д. Туск.

Варта зазначыць, што праблема дэфіцыта бюджэту і роста публічнай запазычанасці перасledуе ўсе польскія ўрады. З большай ці меншай доляй адмоўнае сальда дзяржаўнага бюджэта захоўвалася на працягу ўсіх 2000-х гадоў [14]. У канцы першага квартала 2019 г. дзяржаўная публічная запазычанасць склала больш за 1 більён 5,26 млрд злотых, што азначала рост на 2 % у параўнанні з канцом 2018 г. Калі суадносіць гэтыя дадзеныя з ВУП, то запазычанасць складае 48,9 % ВУП. Але, як зазначаюць эканамісты, на агульнаеўрапейскім узроўні гэтыя лічбы не выглядаюць катастрафічна [15].

Характарызуючы такі эканамічны пакажчык, як рост ВУП, зазначым, што да ўступлення ў ЕС ён у сярэднім складаў 2,98 %. З моманту ўступлення Польшчы ў ЕС ён стала расце. За 2005 – 2016 г. сярэдні пакажчык росту складаў прыкладна 4 %. Аднак не заўсёды рост ВУП быў такім значным. Пад час крызіса 2008-2009 гг. ён складаў каля 1,5 %, што на фоне агульнага спада ў Еўропе было станоўчым момантам [7; 8, s. 14; 16, s. 84; 17]. Польскія ўлады зрабілі стаўку на развіццё малага і сярэдняга бізнэса, стварэнне новых працоўных месцаў. Урад Туска прыкладаў намаганні, каб прывесці ў краіну прамыя замежныя інвестыцыі, што дазваляла польскім таварам больш актыўна выходзіць на еўрапейскі рынак, а таксама імкнуўся з максімальнай

карысцю выкарыстаць сродкі ЕС. Акрамя таго, у лістападзе 2008 г. быў прыняты План стабільнасці і развіцця, які сярод іншага прадугледжваў спрашчэнне адміністрацыйных механізмаў і працэдур, больш хуткае размеркаванне сродкаў, якія шлі з ЕС, а ў жніўні 2009 г. – Антыкрызісны пакет, дзе быў закладзены пункт аб абароне рынку працы. Як вынік, краіна змагла дастаткова хутка выйсці з крызіса. Спецыялісты адзначаюць, што гэтаму паспрыялі вялікі ўнутраны рынак, рост спажывання тавараў, слабая залежнасць эканомікі ад экспарта і слабасць злотага. У 2009 г. правячая кааліцыя змагла скараціць бюджэтныя выдаткі на 21,1 млрд злотых, а рост ВУП склаў 4,2 % [18; 19, s. 277, 279-280]. Калі разглядаць структуру ВУП, то пачынаючы з 2000 г. у ім назіраецца рост долі сферы паслуг. У 2016 г. яна склала 64 %, прамысловасць – 33 %, сельская гаспадарка каля 3 % [7].

Ацэньваючы пакажчыкі трансфармацыі польскай эканомікі, даследчыкі адзначаюць іх устойлівы рост, пачынаючы з 1989 г. На 2014 г. найлепшыя дадзеныя датычыліся малай прыватызацыі і лібералізацыі коштаў. Што датычыцца прыватызацыі прадпрыемстваў, кіравання і рэструктурызацыі прадпрыемствамі, сістэмы гандлю і канкурэнцыі, то гэтыя пакажчыкі хоць і блізкія да пакажчыкаў найбольш развітых эканомік, аднак саступаюць ім па шэрагу крытэрыяў [20, s. 23].

Важную ролю ў развіцці эканомікі адыгрываюць інвестыцыі, якія дазваляюць падтрымліваць станоўчае сальда ў плацёжным балансе. У першую чаргу яны ідуць з ЕС. З мая 2004 г. па канец сакавіка 2019 г. у Польшчу паступіла 163,664 млрд еўра. За той самы перыяд Польшча пералічыла ў бюджэт ЕС 53,681 млрд еўра. Розніца паміж гэтымі лічбамі складае каля 2 % ад сярэдняга ВУП краіны [11]. Пераважную частку інвестыцый складаюць прамыя інвестыцыі. Пачынаючы з 2009 г. яны ідуць на развіццё інфраструктуры, сферы нерухомасці і будаўніцтва, сферу па вытворчасці абсталявання, транспартныя сродкі, сельскую гаспадарку і інш. [21]. Толькі з 2017 па 2019 г. колькасць фірм з замежным капіталам вырасла амаль на 1 пункт і склала 17 %. У працы гэтых фірм задзейнічана каля 35 % працоўных. З 2000 па 2017 г. удзел фірм з замежным капіталам у эканоміцы Польшчы вагаўся ў межах 32-37 % [22, s. 2].

Наплыў замежнага капітала суправаджаўся прытокам новых тэхналогій, усталяваннем сувязей польскіх прадпрыемстваў з замежнымі, у тым ліку ў межах міжнародных карпарацый. Гэта, між іншым, спрыяла росту экспарта і імпарта.

На сённяшні дзень польская эканоміка паказвае стабільны рост. Спецыялісты адзначаюць, што ў значнай ступені гэта адбываецца дзякуючы росту выдаткаў на сацыяльныя праграмы. Перш за ўсё гаворка ідзе пра ініцыяваную ў 2016 г. правацэнтрысцкім урадам праграму “Сям’я 500+” [8, s. 14-15]. Эканамісты зазначаюць, што павелічэнне тавараабароту, большыя выдаткі насельніцтва стымулююць развіццё і рост унутранага рынка. Аднак тут паўстае іншая праблема – росту коштаў альбо спажывецкай інфляцыі. Калі браць пакажчыкі коштаў прададзенай у 2010 г. прамысловай прадукцыі за 100, то ў 2013 г. іх рост склаў 9 %, 2014 – 8 %, 2017 – 9 %. Калі ж узяць за 100 тыя ж пакажчыкі з 2015 г., то іх рост у 2019 г. складае каля 6 % [23]. З іншага боку, у Польшчы назіраецца зніжэнне пакажчыкаў беднасці насельніцтва, хаця ўся эканоміка за гэта і плаціць інфляцыяй. Па дадзеных вывучэння хатняй гаспадаркі Польшчы ў 2018 г. узровень эканамічнай беднасці насельніцтва склаў 5,4 % [24].

Характарызуючы такі пакажчык, як інавацыйнасць эканомікі, даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што ў Польшчы яна ніжэйшая, чым сярэдні пакажчык па ЕС. Сярод слабых бакоў польскай эканомікі называюць ступень узаемадзеяння розных інавацыйных фірм, узровень прадпрымальніцкай ініцыятывы, здольнасць да ўзаемадзеяння прыватнага і публічнага сектараў, узровень патэнтавання новых ідэй, працэнт выдаткаў на інавацыі адносна ВУП. Станоўчымі рысамі выступаюць чалавечы капітал, інтэлектуальныя актывы, інвестыцыі фірм і эканамічныя эфекты [6, s. 55; 25, c. 76].

Такім чынам, станоўчым фактарам у развіцці польскай эканомікі стала ўступленне краіны ў ЕС. Гэта дазволіла ёй павялічыць прыток інвестыцый, атрымаць новыя тэхналогіі і рынкі збыту, стварыць новыя працоўныя месцы. У межах ЕС польская эканоміка адносіцца да ліку “даганяючых”, але такія пакажчыкі, як рост

прадукцыйнасці працы, заробкаў, ВУП дазваляюць гаварыць пра яе дынамічнае развіццё. З другога боку, сярод асноўных эканамічных праблем Польшчы ў XXI ст. выступаюць пастаянны дэфіцыт бюджэта, рост грамадскай запазычанасці, нізкі ўзровень інавацыйнасці. Спецыялісты адзначаюць, што на сучасным этапе польская эканоміка развіваецца ва ўмовах павышанай рызыкі і сур'ёзных выпрабаванняў, аднак гэта характэрна для агульнай сітуацыі ў ЕС.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Mikołajewicz Z. Ekonomiczne i społeczne skutki procesu transformacji w Polsce // Annales Universitatis Mariae Curie-Skłodowska. 2003. Sectio H. Oeconomia 37. S. 361-373. URL: http://bazhum.muzhp.pl/media//files/Annales_Universitatis_Mariae_Curie_Sklodowska_Sectio_H_Oeconomia/Annales_Universitatis_Mariae_Curie_Sklodowska_Sectio_H_Oeconomia-r2003-t37/Annales_Universitatis_Mariae_Curie_Sklodowska_Sectio_H_Oeconomia-r2003-t37-s361-373/Annales_Universitatis_Mariae_Curie_Sklodowska_Sectio_H_Oeconomia-r2003-t37-s361-373.pdf (Дата звароту: 15.06.2018).
2. Węglewski S. Reformy gospodarcze w Polsce 1988-2009 URL: https://www.obserwatorfinansowy.pl/tematyka/makroekonomia/reformy-gospodarcze-w-polsce-2/ (Дата звароту: 18.03.2019).
3. Stasik D. Farbowanie na tygrysa // Newsweek Polska. 22.09.2002. S. 47.
4. Węglewski. S. Plan Hausnera URL: https://www.obserwatorfinansowy.pl/bez-kategorii/plan-hausner/ (Дата звароту: 18.03.2019).
5. Doczłapać się do Unii // Newsweek Polska. 20 października 2002. S. 10-11.
6. Siuta-Tokarska B. Zarys wybranych problemów społeczno-gospodarczych Polski w okresie transformacji systemowej a polityka gospodarcza państwa // Nierówności społeczne a Wzrost Gospodarczy. 2011. Zesyt 19. S. 44-66. URL: http://bazekon.icm.edu.pl/bazekon/element/bwmeta1.element.ekon-element-000171197281 (Дата звароту: 25.10. 2019).
7. Grycuk A., Russel P. Członkostwo w Unii Europejskiej a rozwój gospodarczy Polski. Wybrane zagadnienia // Infos. Zagadnienia społeczno-gospodarcze. URL: http://orka.sejm.gov.pl/WydBAS.nsf/0/8974D205A147BE5AC12581C20036884D/$file/Infos_235.pdf (Дата звароту: 10.04.2019).
8. Kotyński J. Rozwój polskiej gospodarki w latach 2015-2018 na tle międzynarodowym // Kwartalnik naukowy Uczelni Vistula. 2017. Zeszyt 2 (52). S. 9-19. URL: http://cejsh.icm.edu.pl/cejsh/element/bwmeta1.element.desklight-f77b9203-2b21-4262-bcc5-d71a1ec638d1 (Дата звароту: 25.06.2019).
9. Obroty handlu zagranicznego. URL: http://swaid.stat.gov.pl/HandelZagraniczny_dashboards/Raporty_predefiniowane/RAP_SWAID_HZ_3_13.aspx (Дата звароту: 25.10. 2019).
10. Przemysł w Polsce: dynamiczny rozwój polskiego przemysłu. URL: https://www.newsweek.pl/biznes/gospodarka/przemysl-w-polsce-dynamiczny-rozwoj-polskiego-przemyslu/5mwrxn3 (Дата звароту: 25.10.2019).
11. Gadomski W. Polska w Unii Europejskiej: 15 lat minęło. URL: https://www.obserwatorfinansowy.pl/tematyka/makroekonomia/polska-w-unii-europejskiej-15-lat-minelo/ (Дата звароту: 20.10.2019).
12. Orłowski W. M. Zyta kontra Zyta // Wprost. 22 października 2006. S. 52-53.
13. Smoczyński W. Czas zapłaty // Polityka. 12 czerwca 2010. S. 44-47.
14. Bank danych makroekonomicznych. Finanse publiczne. URL: https://bdm.stat.gov.pl/ (Дата звароту: 25.10. 2019).
15. Dług publiczny Polski przekroczył 1 bilion złotych. URL: https://businessinsider.com.pl/finanse/makroekonomia/dlug-polski-przebil-1-bilion-zlotych-z-czego-sie-sklada/tpngtp4 (Дата звароту: 25.10.2019).
16. Jarmołowicz W., Piątek D. Polska transformacja gospodarcza. Przesłanki – przebieg – rezultaty. URL: https://owe.pte.pl/upload/files/ksiazki/05_Jarmolowicz%2C%20Piatek.pdf (Дата звароту: 21.05.2018).
17. Produkt Krajowy Brutto r/r (Polska). URL: https://www.bankier.pl/gospodarka/wskazniki-makroekonomiczne/pkb-rdr-pol (Дата звароту: 25.10.2019).

18. Holser R. Ja rozwiał się kryzys 2007-2009 – infografika, kalendarium. URL: https://www.obserwatorfinansowy.pl/tematyka/makroekonomia/historia-kryzysu-kalendarium/ (Дата звароту: 10.04.2019).

19. Pałaszewski H. Tendencje determinujące rozwój gospodarczy Polski w dobie kryzysu światowego. URL: https://www.researchgate.net/publication/281334433_Tendencje_determinujace_rozwoj_gospodarczy_Polski_w_dobie_kryzysu_swiatowego (Дата звароту: 25.10.2019).

20. Małaga K. Bilans przemian w Polsce w latach 1989-2017 w kategoriach transformacji, wolności gospodarczej i wzrostu gospodarczego // Zeszyty Naukowe Małopolskiej Wyższej Szkoły Ekonomicznej w Tarnowie. T. 37. Nr 1. Marzec 2018. S. 19-34. URL: http://cejsh.icm.edu.pl/cejsh/element/bwmeta1.element.desklight-afcf6fd5-ff4f-4483-8f26-d7811003dc22 (Дата звароту: 10.04.2019).

21. Bank danych makroekonomicznych. Inwestycje. URL: https://bdm.stat.gov.pl/ (Дата звароту: 25.10.2019).

22. Tygodnik gospodarczy PIE. 01. 2019. URL: http://pie.net.pl/wp-content/uploads/2019/01/Biuletyn-PIE_01_2019.pdf (Дата звароту: 10.04.2019).

23. Wskazniki cen produkcji sprzedanej przemysłu w latach 1996-2019. URL: https://stat.gov.pl/obszary-tematyczne/ceny-handel/wskazniki-cen/wskazniki-cen-produkcji-sprzedanej-przemyslu-w-latach-1996-2019,5,1.html (Дата звароту: 25.10.2019).

24. Zasięg ubóstwa ekonomicznego w Polsce w 2018 r. (na podstawie wyników badania budżetów gospodarstw domowych). URL: https://stat.gov.pl/obszary-tematyczne/warunki-zycia/ubostwo-pomoc-spoleczna/zasieg-ubostwa-ekonomicznego-w-polsce-w-2018-roku,14,6.html (Дата звароту: 25.10.2019).

25. Tylec A., Ostraszewska S. Poziom innowacyjności Polski na tle Unii Europejskiej – analiza w oparciu o dekompozycję sumarycznego wskaźnika innowacji (SII) // Zeszyty Naukowe Wyższej Szkoły Humanitas. Zarządzanie. S. 64–77. URL: https://sbc.org.pl/Content/305513/zarz-3-2017-63-78.pdf (Дата звароту: 24.10.2019).

УДК 323.1:94

## ХОРВАТСКАЯ РЕСПУБЛИКАНСКАЯ КРЕСТЬЯНСКАЯ ПАРТИЯ В ПАРТИЙНО-ПОЛИТИЧЕСКОЙ СТРУКТУРЕ КОРОЛЕВСТВА СХС ПОСЛЕ ПАРЛАМЕНТСКИХ ВЫБОРОВ 1923 г.

**В. Н. Кухаренко**

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь; varvara.bsu@gmail.com*

Хорватская республиканская крестьянская партия Степана Радича демонстрировала значительное усиление своих позиций на парламентских выборах в Королевстве СХС. Успех хорватской партии федералистской направленности встревожил правящую Народную радикальную партию и заставил радикалов пойти на попытки соглашения с хорватами и другими представителями оппозиции. ХРКП использовала свою абстиненцию в парламенте не только для участия во внутриполитической борьбе, но и для интернационализации хорватского вопроса.

***Ключевые слова:*** Хорватская республиканская крестьянская партия; Народная скупщина; хорватский вопрос; Федералистский блок.

## CROAT REPUBLICAN PEASANT PARTY IN THE PARTY POLITICAL STRUCTURE OF THE KINGDOM OF SCS AFTER PARLIAMENTARY ELECTIONS 1923

**V. N. Kukharenko**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus;*
*varvara.bsu@gmail.com*

Croat Republican Peasant Party by Stjepan Radić demonstrated a significant strengthening of its position in the parliamentary elections in the Kingdom of SCS. The success of the croatian federalist party alarmed the ruling National Radical Party and forced radicals to attempt an agreement with the Croats and other representatives of the opposition. CRPP not only used its